● *Міхасю Даніленку — 85 гадоў*



# Вытокі творчасці - бацькаўшчына

Многія з нас, пісьменнікаў Гомельшчыны, выраслі пад пільным наглядам Міхася Пятровіча. Працуючы літсупрацоўнікам абласной газеты «Гомельская праўда», ён клапатліва, па-бацькоўску ставіўся да твораў тых пачаткоўцаў, у літаратурных практыкаваннях якіх бачыў зерне таленту. Каб падбадзёрыць, натхніць маладога аўтара, Міхась Даніленка браў ручку і пісаў яму пісьмо, у якім разбіраў вершы альбо апавяданні, даваў надзвычай карысныя парады. Пісьмо магло быць доўгім. Але абавязкова ад рукі. Так, лічыў ён, можна было найбольш шчыра размаўляць з адрасатам.

Пра гэта мы, літаратары, неяк і згадвалі, калі загаварылі пра юбіляра. «Пісьмы ад рукі» атрымлівалі Ніна Шклярава, Мікола Хамянкоў, Уладзімір Бабкоў, аўтар гэтых радкоў, ведаю дакладна – Іван Ласкоў, Мікола Кусянкоў і многія іншыя аўтары...

І вось у гэтыя дні, калі наш Міхась Пятровіч адзначае 85-годдзе, зноў узяў у рукі знаёмыя кнігі з аўтографамі, і ў памяці ажыло некалі прачытанае, аднавілася лёгка і нязмушана. Творы М.Даніленкі пра тых людзей, жыццё, боль і радасці якіх мне таксама блізкія і знаёмыя. Ён піша, на першы погляд, проста, і ў той жа час глыбока заглядвае ва ўнутраны свет чалавека. Пісьменнік добра ведае псіхалогію людзей. Спрабуючы паглыбіцца ў творчую лабараторыю М.Даніленкі, хочацца больш падрабязна спыніцца на асобных яго творах. Вось кніга «Журлівіца». Героі яе падкрэсліваюць адну з галоўных думак: жыць на зямлі – вялікая адказнасць. Адных герояў аўтар заслужана ўхваляе за добрыя ўчынкі, іншым ставіць у дакор памылкі, якія замінаюць ім жыць прыгожа, годна.

З цікавасцю чытаюцца аповесці «Ля Дняпра, у другім эшалоне...» і «Журлівіца» – творы вельмі розныя па сваёй унутранай напоўненасці.

Адзін вядомы празаік заўважыў наконт першай з іх: «Іншы раз і не трэба раман чытаць пра вайну – дастаткова прачытаць невялікую аповесць "Ля Дняпра...». З такой высновай нельга не пагадзіцца.

...Успомнілася мінулае. Даўно было, год каля трыццаці назад. Глыбокай восенню, калі зямля рыхтавалася да першага сняжку, было надзвычай чыстым паветра, мы крочылі ціхім надвячоркам з гомельскай СШ № 16. Мне тады ўпершыню давялося прысутнічаць на сустрэчы пісьменніка з юнай чытацкай аўдыторыяй. Здавалася б, і гады за плячыма ў Міхася Пятровіча, і вопыт настаўніцкай працы, але не мог я не заўважыць яго хвалявання. Хваляваўся. Гэта таму, пэўна, што сур'ёзна, вельмі патрабавальна ставіцца ён да свайго чытача. Таму і зразумела, што дзіцячыя часопісы заўсёды ахвотна друкавалі яго апавяданні. На старонках «Вясёлкі» ён і сёння часты госць.

Вытокі творчасці Міхася Пятровіча – родная бацькаўшчына. Там, на Лоеўшчыне, ён нарадзіўся 28 кастрычніка 1922 года ў сялянскай сям'і. Вёска Ястрабка – зямля продкаў, смутак і пяшчота ягоная. У 1941 годзе будучы пісьменнік закончыў Рэчыцкае педагагічнае вучылішча, а ў ліпені таго ж года быў прызваны ў Савецкую Армію. Удзельнічаў у баях на Паўднёва-Заходнім фронце. У 1942-м быў кантужаны на Украіне і трапіў у палон. Потым былі ўцёкі з лагера ваеннапалонных. Зноў – фронт. Пасля вайны – праца настаўнікам у Казярожскай сямігадовай школе Лоеўскага раёна, вучоба на завочным аддзяленні ў Гомельскім настаўніцкім інстытуце, які скончыў у 1952 годзе. Тады ж выйшла з друку першая кніжка яго прозы «Мая песня», пачалася журналісцкая праца ў рэдакцыі абласной газеты «Гомельская праўда», якой аддадзена трыццаць год жыцця. Гэта быў час паездак па гарадах і вёсках, сустрэч з цікавымі людзьмі, плённай літаратурнай працы. А да шматлікіх баявых узнагарод дабавіліся шматлікія мірныя.

З-пад пяра Міхася Даніленкі ў розныя гады выходзілі наступныя кнігі, акрамя названых вышэй: «Майская навальніца», «Наваселле», «Наш дом», «Запаветны акіян», «Маці Мар'я» (дзве апошнія выдадзены выдавецтвам «Советский писатель»), выбранае «Родная зямля». Дзецям адрасаваны «Вернасць слову», «Зачараваны гарлачык», «На вуліцы Сонечнай», «Ключы бабулі зімы». Асобныя творы ўвайшлі ў шматлікія зборнікі для пазакласнага чытання, можна сустрэць іх і ў школьных падручніках.

На жыццёвым шляху Міхася Пятровіча было шмат набыткаў, але і нямала страт. Страт – непапраўных, на жаль. Нядаўна пахаваў жонку і старэйшую дачку. Страціў нямала сяброў-пісьменнікаў. Але мужаецца радавы вайны і радавы нівы пісьменніцкай. І мы, яго малодшыя калегі, шчыра радуемся, калі сустрэнем у друку чарговую публікацыю Міхася Даніленкі.

Дарэчы, свае творы адпраўляе ў рэдакцыі ён таксама напісанымі ад рукі. Почырк у яго даволі прыгожы, разборлівы і сёння.

Доўгіх і лёгкіх гадоў табе, Міхась Пятровіч!

**Васіль ТКАЧОЎ.**